**Дадатак 2**

Наш праект называецца ***“Славутыя імёны”***, прысвечаны знакамітым людзям нашай Бацькаўшчыны, і прадстаўлены ён будзе ў выглядзе віктарыны.

Спачатку звернемся да тэарэтычнага матэрыялу па тэме “Правапіс вялікай і малой літары ў асабовых назвах”.

**З вялікай літары пішуцца ўсе словы, якія з’яўляюцца:**

***іменамі, іменамі па бацьку, прозвішчамі:*** Іван Дамінікавіч Луцэвіч, Іван Пятровіч Шамякін, Максім Багдановіч, Мікалай Карлавіч Раманоўскі;

***складанымі прозвішчамі, якія пішуцца праз злучок:*** Бялыніцкі-Біруля, Дунін-Марцінкевіч, Эпімах-Шыпіла;

***псеўданімамі:*** Ганна Аршыца (Уладзімір Дубоўка), Якуб Колас і Дзядзька Карусь (Кастусь Міцкевіч), Янка Купала і Стары Мінчук (Іван Дамінікавіч Луцэвіч), Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко), Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава (Францішак Багушэвіч), Цётка (Алаіза Пашкевіч);

***словамі, у якіх засведчаны характэрныя асаблівасці чалавека, яго становішча ў грамадстве, яго якасці:*** Бацька Мінай, Давыд Гарадзенскі, Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Усяслаў Чарадзей.

***Калі імя, прозвішча стаіць у множным ліку і выступае як назва роду ці ўжываецца ў значэнні агульнай назвы, то такое слова таксама пішацца з вялікай літары:***

*род Радзівілаў, маёнтак Тышкевічаў, браты Гарэцкія;*

*Нашы продкі — Глебы, Яраславы — сейбітамі дбайнымі былі (У. Скарынкін).*

**Заўвага 1.** Калі імёны, прозвішчы людзей ужываюцца ў тэксце ў пераносным ці агульным значэнні і тым самым указваюць на характэрную асаблівасць, рысу характару, паводзіны, уласцівыя гэтай асобе, суадносныя з характарам, паводзінамі сусветна вядомых асобаў — сапраўдных носьбітаў гэтых імёнаў, то яны пішуцца з малой літары. Звычайна такія словы маюць пры сабе ў тэксце азначэнне: мецэнат, шэрлакі холмсы (дэтэктывы), абаяльныя эдысаны (вынаходнікі).

**Заўвага 2.** Імёны людзей у множным ліку, калі іх ўжыванне выяўляе пагардлівыя, зневажальныя адносіны да іх аўтара або яны з’яўляюцца родавымі абазначэннямі, пішуцца з малой літары: гарлахвацкія, зёлкіны, тулягі, пісулькіны.

**З малой літары пішуцца ўсе кампаненты:**

***фразеалагізмаў, этымалагічна звязаных з уласнымі назоўнікамі, паколькі такія назоўнікі страцілі сувязь з канкрэтнай асобай ці аб’ектам:*** асядлаць пегаса, за царом гарохам, за дзедам шведам, як заблоцкі на мыле, як піліп з канапель, як марка на пекле.

Сюды ж адносяцца і агульнавядомыя фразеалагізмы тыпу: свінтус-грандыёзус (пра няўдзячнага чалавека, нахабніка).

***перыфразаў-сінонімаў да псеўданімаў і прозвішчаў:*** атаман мужыцкай праўды (Кастусь Каліноўскі); беларускі першадрукар (Францыск Скарына); вялікі Адам (Адам Міцкевіч); заснавальнік беларускай прозы (Якуб Колас); госць з высокага неба, паэт чыстай красы (Максім Багдановіч).

***Віктарына “Хто гэта?”.*** Нагадваем Вам назву нашага праекта “Славутыя імёны” . Ваша задача – па апісанні, а часам і партрэце, змешчаным на слайдзе, успомніць вядомых людзей Беларусі, запісаць іх імёны і прозвішчы ў сшытак.

1. Усходнеславянскі першадрукар, вучоны-энцыклапедыст, медык, батанік, астраном, паэт, асветнік, патрыёт і гуманіст. (Францыск Скарына.)

2. Адзін з выдатных кіраўнікоў і палітыкаў Вялікага Княства Літоўскага, за сваю дзейнасць атрымаў найменне Вялікі, яго вобраз створаны ў паэме “Песня пра зубра”:

Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна
Ставіў багацце духоўнае — злата дзяржавы.

(Князь Вітаўт.)

3. Галоўны арганізатар паўстання ў Беларусі і Літве XIX стагоддзя, наладзіў выпуск першай беларускай газеты «Мужыцкая праўда». (Кастусь Каліноўскі.)

4. Пачынальнік новай беларускай літаратуры, які ствараў наш беларускі тэатр і яго рэпертуар. (В.І. Дунін-Марцінкевіч)

5. Паэт-рамантык, **класік польскай літаратуры**, які нарадзіўся на беларускай зямлі (у Навагрудку), яго творчасць зрабіла вялікі ўплыў на развіццё беларускай літаратуры; ён шырока звяртаўся да сюжэтаў, вобразаў, матываў беларускага фальклору і міфалогіі. У школьную праграму ўключаны яго твор “Гражына”. (Адам Міцкевіч).

6. Літаратуразнаўцы называлі яго госцем з высокага неба, паэтам чыстай красы. Вядома, што ён аўтар аднаго прыжыццёвага зборніка «Вянок» і славутых вершаў «Зорка Венера», «Слуцкія ткачыхі», «Маёвая песня». (Максім Багдановіч).

7. Сярод беларускіх гарадоў Віцебск самы вядомы ў свеце таму, што тут нарадзіўся геній. Гэта мастак, які застаўся верным свайму гораду да скону і ўсё жыццё ствараў свой Віцебск, горад-міф. Назавіце аўтара карціны «Закаханыя над горадам»? (Марк Шагал.)

8. Першы беларускі касманаўт, вучоны ў галіне тэхнічных навук, двойчы Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы Камароўка Брэсцкага раёна ў 1942 годзе. Ажыццявіў тры палёты ў складзе экіпажаў касмічных караблёў і арбітальных комплексаў. (Пётр Клімук.)

9. Авіяканструктар, аўтар больш як 50 самалётаў, 30 з якіх былі пабудаваныя і выпрабаваны, родам з г. Глыбокае Віцебскай вобласці, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы. (Павел Сухі.)

10. Народны мастак Беларусі (1972), народны мастак СССР (1983), правадзейны член АМ Расіі, акадэмік Нацыянальнай АН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1973), Герой Беларусі (2006), аўтар карцін, рэпрадукцыі якіх уключаны ў школьную праграму “ Хлябы”, “Партызанская мадонна”, “Віцебскія вароты”. Важны аўтабіяграфічны цыкл карцін “Лічбы на сэрцы”. (Міхаіл Савіцкі).